тоўскім. Ён пісаў, што Польшча адна не змагла супрацьстаяць крыжакам. Давялося шукаць саюзнікаў у гэтай барацьбе. Першым поспехам польскай дыпламатыі стаў саюз з венгерскім каралем. Але гэты саюз праіснаваў толькі з 1370 г. па 1382 г. і распаўся, паколькі інтарэсы бакоў не супадалі. Асабліва ўмацаваў становішча Польшчы дынастычны шлюб польскай каралевы Ядвігі з вялікім князем літоўскім Ягайлам. Як бачым, пазіцыя акрэслена выразна, і саюз з Літвою быў выгадны ў першую чаргу Польшчы.

Не так даўно аналагічная думка была выказана М.І.Ермаловічам у рабоце «Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд». Прывядзем цытату: «Бясспрэчна, што збліжэнне Польшчы і Вялікага княства Літоўскага было ўзаемавыгаднай справай. І ўсе ж яно было больш выгадным для Польшчы. Пра гэта красамоўна сведчыць ужо тое, што якраз ёй і належыць ініцыятыва. І сапраўды, Польшча ўсе больш, знемагаючы ад барацьбы з крыжакамі, паступова траціла свае землі». Збліжэнне Вялікага княства Літоўскага з Польшчаю пачалося яшчэ з часоў Гедыміна. Крэўская унія яго толькі аформіла, даўшы знешнепалітычных і ваенных турбот княству.

Затое адназначна можна сказаць, што заключэнне уніі было зусім не выгадна ордэну крыжакоў. Ён абвяўляе рашэнне польскага сейма незаконным, па ўсей Германіі рассылаюцца ганцы з паведамленнем, што Польшча імкнецца аб'яднацца з Літвою, каб самой стаць язычніцкай. Таму для выратавання хрысціянства ў хуткім часе ў Прусію пачалі збірацца ўзброеныя паломнікі. У канцы жніўня 1385 г. сам магістр узначаліў паход супраць Вялікага княства. Такім чынам, карыстаючыся нават толькі гэтымі фактамі, на лекцыях і семінарскіх занятках можна дакладна паказаць зацікаўленасць Польшчы ў саюзе з Вялікім княствам Літоўскім.

Ліпень Я.П.,
дацэнт

## ПРАБЛЕМЫ ЎЗАЕМАСУВЯЗІ Ў ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСАЗНАЎЧЫХ ДЫСЦЫПЛІН

На сучасным этапе асноўная ідэя канцэпцыі беларусазнаўства заключаецца ў наданні ўсей сістэме адукацыі нацыянальнай асновы, што патрабуе стварэння новых праграм, дапаможнікаў, іншых сродкаў навучання з улікам сусветнага вопыту. Этнаграфія, фальклор, краязнаўства, іншыя беларусазнаўчыя дысцыпліны неабходна вывучаць не толькі як сялянскую, але і агульнабеларускую спадчыну.

Зараз асобныя беларусазнаўчыя дысцыпліны пачалі выкладацца ў школах, ліцэях, гімназіях, вучні якіх у хуткім часе стануць студэнтамі Беларускага універсітэта культуры. Па-першае, спецыфіка універсітэта культуры патрабуе мець на ўвазе тое, што, акрамя такіх дысцыплін, як этнаграфія, фальклор, краязнаўства, этналінгвістыка, на спецыяльных кафедрах выкладаюцца дысцыпліны, асноўныя для кожнай спецыялізацыі: фальклорны тэатр, народная музыка і спевы, народны танец, народныя святы і абрады, традыцыйныя рамёствы і інш. Адсюль вынікаюць метадычныя задачы: больш лагічны парадак выкладання дысцыплін, іх класіфікацыя, вызначэнне назваў, напрамкаў, асноўных тэм і г.д.

Этнаграфія як больш шырокая навука, што разглядае матэрыяльную і духоўную культуру народа, на наш погляд, павінна выкладацца на першым і другім курсах, а не на трэцім, як зараз, фальклор і іншыя - пасля этнаграфіі. Грунтуючыся на гэтых дысцыплінах, абапіраючыся на іх, спецыяльныя кафедры будуць будаваць свае праграмы, паглыбляючы той ці іншы раздзел этнаграфіі і фальклору ў залежнасці ад спецыялізацыі.

Неабходна таксама больш дакладна вызначыць назву дысцыпліны, якая вывучае фальклор. У шырокім сэнсе фальклор уключае славесную творчасць, музыку, танцы, гульні, рамёствы, нават архітэктуру і інш. Так разглядаць фальклор прапанавалі і ўдзельнікі нарады дзяржаўных экспертаў па захаванню фальклору пры ЮНЕСКА, якая адбылася 1 сакавіка 1985 г. (гл.: Восточно-славянский фольклор: Словарь научной и народной терминологии. - Мн.,1993. - С.376 - 377). У вузкім значэнні - гэта вусна-паэтычная творчасць, што набліжае яе да літаратуры, пра што сведчыць і змест падручніка «Беларуская вусна-паэтычная творчасць» (Мн.,1988). У сусветнай літаратуры, у тым ліку і славянскай, адсутнічае агульная дэфініцыя тэрміна «фальклор», што адбіваецца і на дакладнай класіфікацыі тых ці іншых тэрмінаў. Напрыклад, ужываючы словы «від» і «жанр», мы разумеем адно і тое ж, таму што слова французскага паходжання «жанр» азначае «род», «від».

Трэба звярнуць увагу і на сувязь фальклору і міфалогіі. У слоўніках міфалогія тлумачыцца як накірунак, частка фалькларыстыкі, якая адлюстравана ў фальклорных жанрах: легендах, паданнях, казках і іншых, а таксама ў абрадах. Таму нельга штучна адрываць міфалогію ад фальклору, выкладаючы іх паасобку, на розных курсах, нават міфалогію раней. Гэты механічны падзел не дае магчымасці дакладнага ўжывання тэрміналогіі, класіфікацыі, падрыхтоўкі паўнацэнных пытанняў да іспытаў па міфалогіі. На наш погляд, неабходна аб'яднаць фальклор і міфалогію ў адну дысцыпліну, выкладаць іх ва ўзаемасувязі. Гэта ўжо зроблена

ў «Праграме па фальклору і міфалогіі», створанай навукоўцамі Акадэміі навук Беларусі. Такі ж прынцып рэалізаваны на факультэце завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры.

Вырашэнне ўказаных пытанняў дазволіць хоць бы часткова вырашыць праблему стварэння лагічнай праграмы выкладання беларусазнаўчых дысцыплін і асновы для далейшай работы спецыяльных кафедраў на падрыхтоўцы спецыялістаў у залежнасці ад профілю іх будучай прафесіі.

Мархоцкі Я.Л.,
прафесар

## АБ УДАСКАНАЛЕННІ МЕТОДЫКІ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ

Ва ўмовах пераходу да шматузроўневай сістэмы адукацыі ў галіне культуры і мастацтва ўзрастае роля выкладчыка ва ўдасканаленні методыкі навучання і выхавання студэнтаў.

Найбольш інтэнсіўна здзяйсняецца фарміраванне светапогляду ў студэнцкія гады, калі засвойваецца вялікі паток інфармацыі, закладваюцца асновы будучай прафесіі. У гэтай сувязі лічым, што методыка ўдасканалення навучання і выхавання павінна быць комплекснай.

Навучанне і выхаванне студэнтаў, безумоўна, павінна весціся на высокім прафесійным узроўні. Але, акрамя гэтага, вялікае значэнне маюць якасці педагога. Гэта перш за ўсе гуманныя адносіны да людзей, сумленнасць, праўдзівасць, сціпласць, непрымірымыя адносіны да ілжывасці, несумленнасці, недысцыплінаванасці.

Пры выпрацоўцы маральных якасцей і ідэйнай пераконанасці студэнтаў ў працэсе навучання неабходна памятаць, што пераконанасць не з'яўляецца вынікам пасіўнага ўспрымання, а прадвызначае актыўнае стаўленне студэнта да маральных прынцыпаў, спосабу паводзін. Вялікая роля ў гэтым выкладчыка, уся дзейнасць якога павінна сведчыць аб тым, што прынцыпы, ідэалы, якія ён імкнецца выхоўваць у студэнтаў, маюцца ў яго самога.

Навучаючы і выхоўваючы студэнтаў, патрэбна зыходзіць з таго, што сучасныя студэнты будуць не толькі спецыялістамі ў галіне сваёй прафесіі, але і кіраўнікамі ўстаноў, арганізатарамі, прадпрымальнікамі і грамадскімі дзеячамі. Таму важна выхоўваць іх працаздольнымі і працалюбівымі.

Вялікая роля ў гэтым накірунку адводзіцца індывідуальнай рабоце. Яна стварае даверлівыя адносіны паміж выкладчыкам і студэнтам, дазваляе аказаць дапамогу студэнту ў выбары правільнага вырашэння нават у асабістых пытаннях.

Ідэйная пераконанасць выкладчыка, высокія маральныя якасці, веды і правільнае выкарыстанне законаў і катэгорый філасофіі, уменне добра арганізаваць працу садзейнічаюць духоўнаму збліжэнню настаўніка і вучняў, дазваляюць студэнтам ацэньваць падзеі і факты нашага жыцця, часовыя цяжкасці ў ім. Адначасова выкладчык павінен улічваць асаблівасці складўшагася калектыву групы і курса, псіхалагічныя, інтэлектуальныя і палавыя асаблівасці студэнтаў.

Душу народа можна пазнаць толькі праз знаёмства з яго культурай і гісторыяй. Неабходна беражліва захоўваць і развіваць мову, культуру, народныя традыцыі беларускага народа. Таму выкладанне матэрыялу дысцыплін трэба цесна звязваць з прапагандай беларускіх народных традыцый у розных галінах жыцця, падкрэсліваць ролю выдатных прадстаўнікоў беларускага народа ў развіцці мастацтва, навукі, культуры сваёй краіны.

Кудрыцкі У.І.,
дацэнт

## АСАБЛІВАСЦІ ПРАВЯДЗЕННЯ ЗАНЯТКАЎ У СПЕЦМЕДГРУПАХ ВА ЎМОВАХ БЕЛАРУСКАГА УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ

Методыка заняткаў па фізвыхаванню ў спецмедгрупах пры розных захворваннях шырока асвятляецца ў навуковай і метадычнай літаратуры. Але пытанні іх арганізацыі асвятляюцца недастаткова або падаюцца ў ідэальным класічным варыянце. У працэсе работы ў спецгрупах мы пераканаліся, што вырашыць пытанні арганізацыі груп, камплектавання іх у адпаведнасці з дыягназам захворвання, узростам, полам, фізічнай падрыхтоўкай цяжка заза адсутнасці ў вышэйшых установах дастатковай матэрыяльнай базы, аўдыторнага фонду, фонду заработнай платы. Уплывае тут і спецыфіка раскладу заняткаў і інш. Таму мы вырашылі, зыходзячы з умоў нашага універсітэта, распрацаваць уніфікаваную методыку заняткаў па фізвыхаванню ў спецмедгрупах з мэтай умацавання здароўя хворых студэнтаў і стабілізацыі працэсаў хранічных захворванняў.

Дзеля гэтага распрацавалі рабочы план на навучальны год. Тэарэтычны раздзел плана ўключае прыродазнаўча-навуковыя асновы фізічнага выхавання; урачэбны кантроль і самакантроль; рэжым дня і харчаванне. Практычны раздзел прадугледжвае агульнае ўмацаванне арганізма;